# Маўленне

## § 2. Вусная і пісьмовая формы маўлення. Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо

**9.** Прачытайце тэкст.

Вы, пэўна, не раз чулі і самі вымаўлялі словы *мова* і *маўленне*. А ці задумваліся вы над тым, чым яны адрозніваюцца?

Мову вы вывучаеце ў школе, вывучаеце моўныя сродкі: літары, словы, сказы. Мы выкарыстоўваем іх, калі нам трэба нешта сказаць або напісаць. Калі мы гаворым, то гэта ўжо маўленне.

Такім чынам, **мова** — гэта гукі, літары, словы, словазлучэнні, сказы. **Маўленне** — гэта выкарыстанне мовы ў зносінах з іншымі людзьмі.

Маўленне існуе ў вуснай і пісьмовай формах. Калі мы гаворым, то гэта **вусная форма маўлення**, калі пішам або чытаем — **пісьмовая**.

Што такое мова? Што такое маўленне? Чым яны адрозніваюцца?

Чым адрозніваецца вусная форма маўлення ад пісьмовай?

Якой формай маўлення вы карыстаецеся, калі: а) адказваеце на пытанне настаўніка на ўроку; б) запісваеце пад дыктоўку словы ці словазлучэнні з вывучанымі арфаграмамі; в) выконваеце дамашняе заданне, спісваючы тэкст з падручніка і ўстаўляючы замест пропускаў неабходныя літары?

**10.** Падумайце, якія з прыведзеных уласцівасцей характэрны для вуснага маўлення, а якія — для пісьмовага.

Інтанацыя, тэмп *(хуткі, павольны, нармальны)*, знакі прыпынку, тон (*спакойны, ціхі, вясёлы, ласкавы, бадзёры* і г. д.), абзац, чырвоны радок, паўза, міміка, жэсты.

Выпішыце сродкі выразнасці, характэрныя для вуснага маўлення.

**11.** Прачытайце спачатку верш самі сабе, звяртаючы ўвагу на паніжэнне (стрэлка ўніз) і павышэнне (стрэлка ўверх) тону голасу, кароткую (/) або доўгую (//) паўзу і інтанацыю пры чытанні апавядальных і пытальных, клічных сказаў.

Прачытайце выразна верш, захоўваючы адпаведную інтанацыю і тон голасу.

## Натуршчыца

У двары вясёлы ↘гам: /
Снегавуху лепяць ↘там. //
Пятрок, / Змітрок і ↗Таня /
Снег у камы ↘качаюць.//
Збірае голле ↗Генік, /
Майструе бабе ↘венік. //
Кудлаты Юльчын ↗Буля /
Нясе ў зубах ↘каструлю. //
— А ты чаго тут, / ↗Ганька, /
Са швабраю ля ↗ганка? //
У крыўдзе на сяброў ↗сваіх? //
— А я натуршчыцаю ў ↘іх!

*Н. Мацяш.*



Правообладатель Академия образования

**12.** Разгледзьце малюнкі. На якіх з іх паказана вуснае маўленне, а на якім — пісьмовае? Чым адрозніваецца вуснае маўленне ад пісьмовага?



гаворым ↔ слухаем



пішам



чытаем

Мы амаль увесь час то слухаем некага, то гаворым самі, то чытаем, то пішам — гэта значыць, мы пастаянна ўключаны ў працэс маўленчай дзейнасці. **Маўленчая дзейнасць** — гэта асобы від чалавечай дзейнасці (разам з працоўнай, пазнавальнай, гульнявой і інш.), у час якой чалавек уступае ў маўленчыя зносіны з іншымі людзьмі.

**13.** Прачытайце схему.

ВІДЫ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

| **чытанне** | **слуханне** | **гаварэнне** | **пісьмо** |
|---|---|---|---|
| успрыманне пісьмовага тэксту | успрыманне вуснага выказвання | стварэнне вуснага выказвання | стварэнне пісьмовага тэксту |

Якія існуюць асноўныя віды маўленчай дзейнасці?

Якія віды маўленчай дзейнасці задзейнічаны, калі: а) патрэбна атрымаць гатовую інфармацыю; б) ствараецца ўласнае выказванне?

Якія віды маўленчай дзейнасці існуюць у вуснай форме, а якія — у пісьмовай?

**14.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце напісанне прапушчаных літар, выбар літары з дужак.

1. Са свайго языка спус*(ц/т)*іш — на чуж..м не зловіш.
2. Што напісана пяром, не возьме і сякера.
3. З разумным чалавекам добра і пагав..ры*(ц/т)*ь.
4. Слова — вецер, а піс..мо — грунт.
5. Слухай многа, а г..вары мала.
6. Менш г..вары — больш пачуеш.
7. Ч..тае — як рэпу грызе.

У якіх прыказках гаворыцца пра вуснае маўленне і слуханне? У якіх — пра пісьмовае маўленне і чытанне?

Зачытайце прыказку, у якой выказана папярэджанне: перш чым сказаць, трэба добра падумаць. Як вы думаеце, чаму гэта так істотна ў размове?

Запішыце прыказкі, якія гавораць: трэба ўмець слухаць. Як вы разумееце іх сэнс?

**15.** Спішыце выказванні пра мову, устаўляючы прапушчаныя літары. Як вы разумееце іх сэнс?

1. Тр..ба любі́ць, ведаць і шанаваць* мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю *(Я. Колас)*. 2. Найв..лікшае багац..е народа — яго мова! Тысячагод..ямі назапашваюцца і вечна ж..вуць у слове н..злічоныя скарбы ч..лавечай думкі і вопыту *(М. Шолахаў)*. 3. Яно добра, а нават і тр..ба знаць суседскую мову, але найперш тр..ба знаць сваю *(Ф. Багушэвіч)*. 4. Мова — гэта в..лікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны наро.. *(І. Мележ)*.

Знайдзіце і падкрэсліце ў выказваннях літары, якія абазначаюць падоўжаныя гукі.



Правообладатель Академия образования